УДК 332.38

# РЭГІЯНАЛЬНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ І ПРАБЛЕМЫ ЗЕМЛЕКАРЫСТАННЯ Ў РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ

***А.А. Варатнікоў**, аспірант*
*Навуковы кіраўнік – **У.У. Піменаў,** к.э.н., дацэнт*
*Дзяржаўны універсітэт па землеўпарадкаванню, г. Масква*

У Рэспубліцы Беларусь актыўна ідзе працэс пераходу эканомікі на інавацыйны шлях развіцця. Адным з бакоў дадзенага працэсу з'яўляецца актыўнае ўцягванне ў эканамічны абарот наяўных прыродных рэсурсаў (у першую чаргу зямельных), якое магчыма ажыццяўляць праз сістэму планавання землекарыстання. Дадзеная сістэма ўяўляе сабой адзінства па вертыкалі і гарызанталі планавых і прагнозных землеўладкавальных дакументаў (схем землеўпарадкавання, схем выкарыстання і аховы зямель), у якіх адлюстроўваюцца асноўныя перспектыўныя шляхі выкарыстання зямель, прапановы па ўдасканаленні размеркавання зямель паміж галінамі эканомікі,

ахове зямель ад негатыўнага ўздзеяння і інш. Нармальна функцыянуючая сістэма планавання землекарыстання забяспечвае ўключэнне зямельных рэсурсаў у эканамічны абарот, стварае ўмовы для развіцця і функцыянавання адкрытага рынку зямлі і яго інфраструктуры, дазваляе арганізаваць рацыянальнае выкарыстанне зямельных рэсурсаў і іх ахову.

Землекарыстанне ў Рэспубліцы Беларусь значна дыферэнцыравана, што выклікана істотнымі адрозненнямі прыроднага, эканамічнага і сацыяльнага характару ў розных рэгіёнах. Гэтыя адрозненні праяўляюцца ў прыродных умовах, асваенні тэрыторыі, развіцці сістэмы рассялення і транспартных шляхоў, якасным стане зямельных рэсурсаў і інш. Для эфектыўнага і ўстойлівага землекарыстання неабходна ўлічваць дадзеныя адрозненні, вызначыць найбольш мэтазгодныя шляхі выкарыстання зямельных рэсурсаў. Усе вышейсказанае выклікала з'яўленне ў сістэме планавання землекарыстання новага віду землеўпарадкавальнага дакумента - рэгіянальнай схемы выкарыстання і аховы зямельных рэсурсаў[1]. Мэта распрацоўкі гэтага дакумента - павышэнне эфектыўнасці рацыянальнага выкарыстання зямель і іх аховы ў канкрэтным разглядаемым рэгіёне. Пад «рэгіёнам» у дадзеным выпадку неабходна разумець «тэрыторыю, частку краіны, якая адрозніваецца сукупнасцю прыродных або гістарычна склаўшыхся ўмоў землекарыстання і валодае агульнасцю спецыфічных прыродных або антрапагенных праблем выкарыстання і аховы зямель». У якасці такіх спецыфічных умоў і праблем выкарыстання і аховы зямельных рэсурсаў могуць выступаць: прыродныя (узровень зямельна-рэсурснага патэнцыялу тэрыторыі, наяўнасць маштабных і аднатыпных абмежаванняў землекарыстання, шырокамаштабная меліярацыя зямель і інш.); экалагічныя (распаўсюджванне працэсаў дэградацыі зямель (водная і ветравая эрозія , падтапленне, забалачванне, апустыньванне), забруджванне зямель адходамі вытворчасці, хімічнымі і радыеактыўнымі рэчывамі, высокая ступень антрапагеннай нагрузкі і інш.) і сацыяльна-эканамічныя (узровень сацыяльна-эканамічнага развіцця тэрыторыі, «дэпрэсіўныя» і прыгранічныя раёны, шчыльнасць засялення тэрыторыі і інш.).

Разгледзім некаторыя рэгіёны, выдзеленыя па вышэйвыкладзеным спецыфічным прыродным, сацыяльна-эканамічным і экалагічным умовам.

*Тэрыторыі, якія падвергліся забруджванню радыёнуклідамі ў выніку катастрофы на Чарнобыльскай АЭС.* Да дадзеных тэрыторый адносяць паўднёвы ўсход Магілёўскай вобласці, паўднёвы ўсход і ўсход Гомельскай вобласці. У Нацыянальнай стратэгіі ўстойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на перыяд да 2020 года[3] адзначаецца што, самай важнай і найбольш складанай задачай рэгіянальнай стратэгіі ўстойлівага развіцця з'яўляецца пераадоленне наступстваў чарнобыльскай катастрофы. Стратэгія ўстойлівага развіцця тэрыторый радыеактыўнага забруджвання павінна будавацца з улікам неабходнасці павышэння дабрабыту пражываючага тут насельніцтва на аснове комплекснай эколага-радыёлагічнай і сацыяльна-эканамічнай рэабілітацыі забруджаных рэгіёнаў. Гэтыя мерапрыемствы ў дачыненні зямельнага фонду даных тэрыторый могуць знайсці эфектыўныя рашэнні ў рэгіянальных схемах выкарыстання і аховы зямельных рэсурсаў.

*Беларускае Палессе*, якое характарызуецца маштабнай меліярацыяй зямель, нерацыянальным іх выкарыстаннем і аховай, з прычыны чаго на гэтай тэрыторыі выявіліся некаторыя адмоўныя ўздзеянні на водны рэжым, ландшафты, глебавае покрыва, раслінны і жывёльны свет. На асушаных тарфяніках падчас адсутнасці раслінасці развіваюцца працэсы тэрмічнага і мікрабіялагічнай распаду торфу, ветравай і воднай эрозіі. Вырошчванне прапашных культур на тарфяніках выклікае максімальную страту торфу. Адзначаныя адмоўныя з'явы, якія праявіліся ў працэсе гаспадарчага асваення Палесся, з'яўляюцца вынікам асобных памылак і пралікаў у планаванні, будаўніцтве і эксплуатацыі меліярацыйных сістэм. Таму на сучасным этапе распрацоўка новай схемы комплекснага выкарыстання і аховы зямельных рэсурсаў з улікам прыродных асаблівасцяў тэрыторыі з'яўляецца неабходнай умовай для яе далейшага ўстойлівага развіцця.

*Беларускае Паазер'е* з'яўляецца адзіным рэгіёнам Рэспублікі Беларусь, які не падвергся радыяктыўнаму забруджванню. У сувязі з гэтым галоўнай мэтай, што стаіць перад рэгіёнам, з'яўляецца развіццё рэкрэацыйнай і турыстычнай дзейнасці. Дасягненне пазначанай мэты магчыма пры вырашэнні наступных задач[2]: удакладненне спецыялізацыі сельскагаспадарчых прадпрыемстваў з улікам ацэнкі аграэкалагічнага патэнцыялу розных ландшафтаў і іх экалагічна дапушчальнага спрашчэння; экалагічная разпрацоўка метадаў меліярацыі зямель з улікам асаблівасцяў рэгіёну; рэзерваванне тэрыторый для рэкрэацыйнага выкарыстання; удасканаленне прыродна-запаведнага фонду ў мэтах фарміравання экалагічнага каркаса рэгіёну і ўключэння

Беларускага Паазер'я ў агульнаеўрапейскую экалагічную сетку. Названыя задачы магчыма эфектыўна вырашаць у рэгіянальных схемах выкарыстання і аховы зямельных рэсурсаў.

*Мінская сталічная акруга*, якая ўключае ў сябе Мінск і бліжэйшыя раёны - Мінскі, Дзяржынскі, Смалявіцкі, Пухавіцкі. Прафесар Белдзяржуніверсітэта Л.В. Казлоўская адзначае[2], што «праблема ў развіцці Мінскай сталічнай акругі заключаецца ў неадпаведасці структуры яго гападаркі выкананню сталічных функцый (празмернае развіцце прамысловасці і недастатковае – сферы абслугоўвання), у неабходнасці пашырэння адміністрацыйных межаў горада і акругі для аптымізацыі тэрытарыяльнай арганізацыі ўсей Мінскай агламэрацыі». У сувязі з гэтым, распрацоўка рэгіянальнай схемы выкарыстання зямель на тэрыторыю Мінскай сталічнай акругі дазволіць вызначыць найбольш эфектыўныя шляхі вырашэння гэтых праблем з пункту гледжання іх землеўпарадкавальнага забеспячэння.

У заключэнне неабходна адзначыць, што распрацоўка рэгіянальных схем выкарыстання і аховы зямельных рэсурсаў з улікам існуючых праблем выкарыстання зямель будзе спрыяць ўстойліваму сацыяльна-эканамічнаму развіццю эканомікі Рэспублікі Беларусь ў цэлым.

## Спіс выкарастаных крыніц


1. Кодекс Республики Беларусь о земле. – Мн.: Национальный центр правовой информации Республики Беларусь, 2009;

2. Козловская Л.В. Социально-экономическая география Беларуси: Курс лекций: В 3 ч. Ч.3: Экономико-географическое районирование и характеристика регионов Беларуси.- Мн.: Издательство БГУ, 2004;

3. Национальная стратегия устойчивого социально-экономического развития Республики Беларусь на период до 2020 г. / Национальная комиссия по устойчивому развитию Республики Беларусь; редкол.: Я.М. Александрович и др. – Мн.: Юнипак, 2004.